# ПАМЯТНЫЯ КНІЖКІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ: вяртанне ў новым фармаце

*Карысную справу, вартую павагі, зрабілі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выпусціўшы тры мультымедыйныя дыскі, на якіх змешчаны поўны збор памятных кніжак Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Цяпер багаты фактaлагічны матэрыял па гісторыі, культуры і гаспадарцы гэтых губерняў будзе даступным для ўсіх аматараў гісторыі.*

У пачатку 2012 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) выпусціла ў свет камплект з трох мультымедыйных дыскаў, прысвечаных Памятным кніжкам Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў другой паловы XIX — пачатку XX ст.*. Гэтае выданне стала адным з вынікаў працы бібліятэкараў па збіранні і захаванні нацыянальнай дакументальнай спадчыны, імкнення зрабіць яе даступнай для шырокага кола чытачоў: навукоўцаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў бібліятэк, архіваў і музеяў, аспірантаў, студэнтаў, краязнаўцаў, аматараў гісторыі.

Памятныя кніжкі беларускіх губерняў адносяцца да гістарычных крыніц фактаграфічнага характару, якія змяшчаюць разнапланавыя звесткі аб асобных частках этнічна беларускіх тэрыторый. Яны выходзілі з сярэдзіны XIX ст. да 1916 г.: Віцебскай губерні — у 1861—1914 гг., Гродзенскай губерні — у 1847—1915 гг., Магілёўскай губерні — у 1853—1916 гг., Мінскай губерні — у 1845—1916 гг. Выданне памятных кніжак Віленскай губерні пачалося ў 1845 г. і доўжылася да 1915 г. Часам па розных прычынах выпуск гэтых выданняў прыпыняўся, але праз некаторы час узнаўляўся. Адбываліся таксама і змены назваў**. Памятныя кніжкі губерняў былі вынікам работы губернскіх статыстычных камітэтаў, якія пачалі ствараца ў 1834 г. як органы сістэмы збору і апрацоўкі статыстычных даных, што наладжвалася ў Расійскай Імперыі. Перад імі ставіліся таксама задачы па выяўленні і апісанні мясцовых гістарычных помнікаў. Для сучасных гісторыкаў і краязнаўцаў гэтыя выданні цікавыя як крыніцы, што змяшчаюць вялікую колькасць інфармацыі аб насельніцтве, прыродных умовах і эканамічным развіцці беларускіх губерняў, даведачны матэрыял (адрасы ўстаноў, прадпрыемстваў, вайсковых частак, службовых асоб і г.д.), тэксты палажэнняў, інструкцый, правілаў і іншых дакументаў мясцовых улад. Такія звесткі дапамагаюць даследчыкам прааналізаваць змяненні, што адбываліся ў губернях на працягу значнага перыяду часу. Вялікую частку матэрыялаў Памятных кніжак губерняў складаюць публікацыі мясцовых краязнаўцаў з цікавымі гістарычнымі экскурсамі. Яны ўтрымліваюць

* Памятные книжки белорусских губерний [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. Электронные текстовые, графические данные и программа (10,5 Гб). Минск: Национальная библиотека Беларуси, 2012. 3 электронных оптических диска (DVD-ROMа). Системные требования: Intel Pentium II 400; RAM 64; SVGA; Windows 98. Заглавие с титульного экрана.

** Памятныя кніжкі Мінскага губернскага статыстычнага камітэта на 1889, 1892—1894 і 1900—1904 гг. выходзілі пад назвай "Памятная книжка и календарь Минской губернии", на 1869 і 1909—1917 гг. — "Памятная книжка Минской губернии и календарь". У Віцебскай губерні адпаведны даведнік на 1862 г. выдаваўся пад назвай "Памятная книжка Витебской губернии", на 1890 г. — "Адрес-календарь Витебской губернии". У Магілёўскай губерні — "Адрес-календарь Могилевской губернии на 1876 год", "Адрес-календарь и памятная книжка Могилевской губернии на 1905 год", "Памятная книжка и календарь Могилевской губернии на 1908 год". Найчасцей змянялася назва даведніка Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта: на 1858—1866, 1869, 1874 (ч. 1—2), 1875 (ч. 1), 1876 (ч. 1), 1877 (ч. 1), 1878 (ч. 1), 1890—1910 гг. выдавалася "Памятная книжка Гродненской губернии", на 1867 г. быў выпушчаны "Адрес-календарь служащих в Гродненской губернии лиц гражданского, военного и духовного ведомства", на 1879—1889 гг. надрукавана "Памятная книжка Гродненской губернии. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения". Вар'іравалася назва і Памятных кніжак Віленскай губерні (напрыклад, "Памятная книжка Виленской губернии на 1878 год. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения" і інш.).




*Камплект мультымедыйных дыскаў "Памятные книжки белорусских губерний. Витебская, Минская, Могилёвская". Яго можна набыць у кіёску ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.*

багаты фактаграфічны матэрыял, што можа выкарыстоўвацца разам з іншымі крыніцамі ў гістарычных і краязнаўчых даследаваннях, адукацыйнай дзейнасці.

Памятныя кніжкі губерняў былі звычайнымі тыражнымі выданнямі, якія распаўсюджваліся па самых розных установах і асабістых кнігазборах Расійскай Імперыі. Сёння яны захоўваюцца ў фондасховішчах бібліятэк, архіваў і музеяў Беларусі, Расійскай Федэрацыі, Літвы і інш. Яшчэ ў 2004 г. супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі разам з Фундаментальнай бібліятэкай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пачалі фарміраваць лічбавую калекцыю "Крыніцы па гісторыі Беларусі XVIII — пачатку XX ст.". Яна ствараецца (праект доўжыцца і цяпер) на аснове дакументаў, якія захоўваюцца ў фондах гэтых бібліятэк. У калекцыю ўключаюцца і лічбавыя копіі Памятных кніжак губерняў. Аднак неабходна заўважыць, што ў Беларусі захоўваюцца не ўсе экземпляры Памятных кніжак беларускіх губерняў. Найбольш шырока прадстаўлены яны па Віцебскай губерні (каля 80% ад агульнай колькасці выпускаў), па іншых губернях — значна менш. Таму перад Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі паўстала задача выявіць усе выданні Памятных кніжак беларускіх губерняў, зрабіць іх лічбавыя копіі і прадставіць адзіным масівам. Найперш былі адабраны і скапіраваны выпускі Памятных кніжак з фондаў НББ (гэта самая істотная частка), потым — экземпляры, якіх не было ў НББ, але яны захоўваліся ў фондах іншых устаноў Беларусі. Лічбавымі копіямі выданняў, якіх не было ў Беларусі, падзяліліся Бібліятэка Вільнюскага ўніверсітэта і Расійская Нацыянальная Бібліятэка. Такім чынам удалося стварыць лічбавыя калекцыі поўных камплектаў Памятных кніжак трох беларускіх губерняў: Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай. Яны былі пакладзены ў аснову электронных выданняў. Акрамя дакладных графічных вобразаў выданняў тут змешчаны гістарычныя даведкі і навуковыя публікацыі па тэме, ілюстрацыйны і музычны матэрыял; выяўленчыя дакументы сярэдзіны XIX — пачатку XX ст. з фондаў НББ: карты, планы, гербы, парт-рэты, паштоўкі, малюнкі з відамі гарадоў, помнікаў ар-хітэктуры і інш. Узнаўляюць гістарычную эпоху фрагменты музычных твораў кампазітараў XIX ст., жыццё і творчасць якіх цесна звязана з Беларуссю: К.Ельс-кага, М.Ельскага, В.Казлоўскага, С.Манюшкі, К.Марцінкевіч, М.К.Агінскага, Н.Орды, Л.Скрабецкага.

Бадай самай няпростай задачай было стварыць даведачна-пошукавы апарат выдання. Былі сфарміраваны дапаможныя паказальнікі аўтараў артыкулаў і гістарычных матэрыялаў і аўтараў артыкулаў з кароткімі біяграфічнымі звесткамі. Паказальнікі па ўсім алічбаваным масіве забяспечваюць хуткі пошук арыгінальных аўтарскіх работ і гістарычных першакрыніц, змешчаных на старонках Памятных кніжак. Вядома, хацелася ўключыць усе прозвішчы, назвы ўстаноў і населеных пунктаў, якія сустракаюцца ў кніжках. Аднак гэта велізарная работа, прычым не столькі тэхнічная, колькі навуковая: скразная ідэнтыфікацыя асоб, устанаўленне дакладных назваў устаноў на працягу ўсяго перыяду і г. д. Яна, як і шмат іншых тэм і аспектаў разгляду, яшчэ чакае даследчыкаў. Падкрэслім, што поўных калекцый друкаваных Памятных кніжак губерняў у Беларусі няма. Таму іх электронныя выданні ўпершыню адкрылі перад даследчыкамі магчымасць вывучаць гістарычныя з'явы на аснове вялікага і ўнікальнага масіву звестак, пасля-доўнасць якіх дакладна ўзноўлена, але пакуль толькі па трох беларускіх рэгіёнах — былых губернях Расійскай Імперыі: Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай. Наперадзе работа па збіранні і выданні лічбавых калекцый па Гродзенскай і Віленскай губернях.

***Таццяна Кузьмініч***,
*намеснік дырэктара па інфармацыйных рэсурсах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.*